Ганна
СКАРЖЫНСКАЯ-САВІЦКАЯ

# ЯК ЗВЯРКІ ДАПАМАГЛІ БОЖАЙ КАРОЎЦЫ



***Казка***

Летнім спякотным днём зайчык Вушасцік бег да ручая, каб ахаладзіцца і вадзіцы напіцца.

Раптам звярок спыніўся. Каля бярозкі з травы чуліся ціхія ўсхліпы — хтосьці плакаў. Добры зайчык расхіліў траву і ўбачыў на лісціку рамонка Божую Кароўку.

— Гэта ты плачаш? — спытаў Вушасцік.

— Я-а-а-а, сарафанчык парвала, — пазірала чорнымі вочкамі кузурка.

— Не бяда. Гэта мы паправім. Не хвалюйся.

— Але ж згубілася мая чорная кропачка — шостая. Хто мне цяпер паверыць, што мне шэсць гадзікаў? Хто мяне возьме ў лясную школу? А-а-а-а! Хачу ў школу! — плакала Божая Кароўка.

— Не плач, — усміхнуўся Вушасцік. — Лепш сядай мне на спіну — і гайда да майго сябрука вожыка Калючыка. Ён тваю праблему адной сваёй іголкай вырашыць.

Божая Кароўка прымасцілася ў пухнатым кажушку зайчыка і яны паімчаліся да вожыка. Час ад часу Вушасцік пытаў:

— Ты там не згубілася?

— Не, не згубілася, — адказвала пасажырка і мацней трымалася за варсінкі кажушка.

Хутка яны дабраліся да вожыкавага доміка.

— Тук-тук-тук, — пастукаў зайчык Вушасцік.

— Заходзьце, я дома, — запрасіў ветлівы Калючык.

Ён выслухаў зайчыка і сказаў:

— Я дапамагу, зацырую твой сарафанчык, не хвалюйся, Божая Кароўка, — супакоіў кузурку звярок.



Ён спрытна зацыраваў дзірачку і прышыў чорную кропачку.

— Трымай сваю адзежку, — сказаў вожык Калючык.

Божая Кароўка ўзрадавалася. Яна закружылася ў чырвоным сарафанчыку.

— Дзякуй, дзякуй вам, сябры! Сарафанчык як новенькі! — радасна ўсклікнула яна.

— Будзем сябраваць. Звяртайся, калі што, — усміхнуўся вожык Калючык.

Божая Кароўка закружылася ў паветры і заспявала песеньку:

*Свеціць сонца над палянкай,*
*Дзень паслаў сяброў мне зранку.*
*Ля-ля-ля-ля-ля!*
*Зайчык шчыры ля бярозкі*
*Выцер горкія мне слёзкі.*
*Ля-ля-ля-ля-ля!*
*Потым вожык суцешыў —*
*Сарафанчык мне зашыў!*
*Ля-ля-ля-ля-ля!*
*Дабрыню я не забуду —*
*Сябраваць я з вамі буду!*
*Ля-ля-ля-ля-ля!*

Вожыку Калючыку і зайчыку Вушасціку вельмі спадабалася песенька, таму што яна была пра сяброўства. А яно вельмі каштоўнае ў жыцці.

Божая Кароўка развіталася з новымі сябрамі і паляцела вандраваць.

